# Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён»: *дзень за днём*



## 23 чэрвеня – 28 ліпеня 1944 г.



**Анатоль Крыварот,**
вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інтытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт



Калона 9-й нямецкай арміі, разбітая ударам з паветра непадалёк ад Бабруйска

Завяршальны матэрыял сумеснага праекта часопіса «Навука і інавацыі» і Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Освобождение. Хроника событий», прысвечанага 80-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, раскрывае падрабязнасці адной з самых значных падчас Вялікай Айчыннай вайны аперацый – «Баграціён», якая складалася з двух этапаў.



Партызанскі парад у Мінску. 16 ліпеня 1944 г.

## Этап першы: ліквідацыя нямецкай абароны

Пачатак стратэгічнаму наступленню паклалі Віцебска-Аршанская і Магілёўская франтавыя аперацыі. Раніцай 23 чэрвеня 1944 г. галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускага франтоў (камандуючыя І.Х. Баграмян, Г.Ф. Захараў, І.Д. Чарняхоўскі) пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках. На наступны дзень, 24 чэрвеня, разгарнулі наступленне на бабруйскім напрамку войскі правага крыла 1-га Беларускага фронту (камандуючы К.К. Ракасоўскі) [1].

Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту ва ўзаемадзеянні з 3-м Беларускім фронтам 25–28 чэрвеня падчас Віцебска-Аршанскай аперацыі акружылі і разграмілі віцебскую групіроўку ворага ў складзе 5 дывізій. У выніку баявых дзеянняў войскамі франтоў сумесна былі вызвалены Віцебск (26 чэрвеня) і Лепель (28 чэрвеня). У раёне Віцебска праціўнік страціў 20 тыс. чалавек забітымі і больш за 10 тыс. палоннымі [1, 2, 4, 5].

Ва ўпартых баях да 4 ліпеня 1944 г. часцямі і злучэннямі 1-га Прыбалтыйскага фронту былі вызвалены ад германскіх войск больш за тысячу населеных пунктаў і 12 раённых цэнтраў БССР, у тым ліку Чашнікі (27 чэрвеня), Ушачы (29 чэрвеня), Докшыцы (2 ліпеня), Глыбокае (3 ліпеня), Полацк (4 ліпеня). У раёне райцэнтра Ветрына 29 чэрвеня савецкімі войскамі была перарэзана чыгунка Полацк – Маладзечна. У вызваленні Полацка прымалі ўдзел часці і злучэнні 6-й гвардзейскай арміі, штаб якой узначальваў беларус – генерал В.А. Пянькоўскі, а таксама 119-я стралковая дывізія пад камандаваннем ураджэнца Віцебшчыны генерала І.І. Харуна [1, 3, 4, 6, 7].

Войскі 3-га Беларускага фронту за тры дні наступлення прарвалі абарону немцаў у паласе шырынёй 100 км ад Заходняй Дзвіны да Дняпра, заглыбіліся ў баявыя парадкі немцаў на 30–50 км, у некалькіх месцах перарэзалі чыгунку Віцебск – Орша. У паласе 5-й арміі (камандуючы М.І. Крылоў) уведзеная ў прарыў конна-механізаваная група і стралковыя часці арміі 25 чэрвеня вызвалілі райцэнтры Багушэўск і Сянно, войскі 31-й арміі (камандуючы В.В. Глаголеў) 26 чэрвеня выбілі акупантаў з райцэнтра Дуброўна. У той самы дзень часці 3-га гвардзейскага танкавага корпуса авалодалі Талачыном [1, 4, 7].

Падчас правядзення Віцебска-Аршанскай аперацыі войскамі левага крыла 3-га Беларускага фронту быў ліквідаваны моцны вузел нямецкай абароны на ўсход ад Оршы, што дазволіла 27 чэрвеня часцям 11-й гвардзейскай (камандуючы К.М. Галіцкі) і 31-й армій вызваліць горад. У ворага былі захоплены 9 чыгуначных эшалонаў, 37 гармат, 19 танкаў і бронемашын, 161 трактар, 1950 аўтамашын і цягачоў. Страты праціўніка забітымі склалі 1,2 тыс. Былі ўзяты ў палон больш за 100 салдат і афіцэраў [1, 5, 7]. Баявыя дзеянні наземных сіл у раёне Дуброўна і Оршы надзейна прыкрывалі з паветра лётчыкі 2-га знішчальнага авіяцыйнага корпуса пад камандаваннем беларуса – Героя Савецкага Саюза, генерал-лейтэнанта авіяцыі А.С. Благавешчанскага [1, 4, 5, 7].

Па стане на 27 чэрвеня 1944 г. у паласе наступлення фронту савецкія часці заглыбіліся ў абарону ворага на 115 км і пашырылі прарыў на 150 км, вызвалілі 1674 населеныя пункты, акружылі і поўнасцю знішчылі 2 пяхотныя і 2 авіяпалявыя дывізіі, разграмілі 4 пяхотныя дывізіі, яшчэ 2 пяхотным і 1 ахоўнай дывізіям былі нанесены вялікія страты [5].

На наступны дзень пасля вызвалення Оршы перадавым падраздзяленням 3-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса ўдалося фарсіраваць важны водны рубеж – Беразіну – і захапіць плацдарм на заходнім беразе. Калі наступленне армій правага крыла і цэнтра 3-га Беларускага фронту разгортвалася даволі паспяхова, то прасоўванне



Камандуючы 1-м Беларускім фронтам генерал арміі К.К. Ракасоўскі ў першыя дні аперацыі «Баграціён»

левафланговых войск ажыццяўлялася з вялікімі цяжкасцямі, у тым ліку і з прычыны ўпартага супраціўлення гітлераўцаў, перад якімі была пастаўлена задача прыкрыць адступленне магілёўскай групіроўкі [5].

Пераадольваючы моцную абарону праціўніка, войскі 3-га Беларускага фронту на завяршальным этапе Віцебска-Аршанскай аперацыі і пры разгортванні Мінскай вызвалілі абласны цэнтр Вілейка (2 ліпеня) і 9 райцэнтраў, у тым ліку Крупкі і Круглае (28 чэрвеня), Барысаў (1 ліпеня), Лагойск і Смалявічы (2 ліпеня). Савецкія войскі адсеклі 3-ю танкавую армію вермахта ад 4-й палявой арміі і перарэзалі чыгунку Мінск – Вільнюс. У баях па фарсіраванні Беразіны і вызваленні Барысава паспяхова дзейнічаў 25-ы танкавы корпус пад камандаваннем ураджэнца г. Дзяржынска Мінскай вобласці генерала Я.І. Фамiных, які быў уведзены ў прарыў 25 чэрвеня 1944 г. У гэтым жа раёне вызначылася 1-я гвардзейская Пралетарская, Маскоўска-Мінская стралковая дывізія ўраджэнца Барысава гвардыі палкоўніка П.Ф. Тоўсцікава [1, 4, 6].

Аб упартым супраціўленні нямецкіх войск у паласе наступлення 3-га Беларускага фронту сведчаць страты яго фарміраванняў з 23 чэрвеня і да канца месяца: 51 526 чалавек асабовага складу, у тым ліку 11 014 загінуўшых, 318 танкаў, 59 гармат і мінамётаў, 113 самалётаў [5].

У складзе 2-га Беларускага фронту 23 чэрвеня разгарнулі наступленне 33-я (камандуючы В.Д. Кручонкін), 49-я (камандуючы І.Ц. Грышын), 50-я (камандуючы І.В. Болдзін) і 4-я паветраная (камандуючы К.А. Вяршынін) арміі. Для развіцця прарыву абароны праціўніка была створана франтавая рухомая




Беларуская аперацыя 23 чэрвеня – 28 ліпеня 1944 г.

група пад камандаваннем генерала А.А. Цюрына. Галоўны ўдар у напрамку Магілёва наносілі часці і злучэнні 49-й арміі, якія ва ўмовах жорсткага супраціўлення немцаў паслядоўна фарсіравалі рэкі Проня і Бася. Пасля ўпартых баёў войскі фронту 26 чэрвеня прарвалі абарону на рацэ Рэста. У той самы дзень 49-я армія дасягнула Дняпра на поўнач ад Магілёва, і яе перадавыя часці фарсіравалі раку і захапілі плацдарм на заходнім беразе. Раніцай 27 чэрвеня падраздзяленні франтавой рухомай групы пераправіліся праз Днепр і абышлі Магілеў з паўднёвага захаду і захаду, чым адрэзалі шляхі адыходу праціўніка. На наступны дзень войскі фронту завяршылі фарсіраванне Дняпра. Шэсць спробаў ворага вырвацца з Магілёва былі спынены савецкімі войскамі. Пасля штурму спецыяльна створанымі групамі рэшткі нямецкага гарнізона ў 18 гадзін 28 чэрвеня спынілі супраціўленне і склалі зброю. У вызваленні г. Чавусы, акружэнні і знішчэнні групіроўкі немцаў у раёне Магілёва ўдзельнічаў 38-ы стралковы корпус пад камандаваннем генерала А.Д. Церашкова, беларуса. У баях за Магілёў немцы панеслі адчувальныя страты ў жывой сіле, тэхніцы і ўзбраенні: больш за 6 тыс. забітымі, 3,4 тыс. палоннымі, 70 танкаў і штурмавых гармат, больш за 200 гармат і мінамётаў, 840 аўтамашын [1, 4, 5].

У час правядзення Магілёўскай аперацыі войскі 2-га Беларускага фронту вызвалілі абласны і 4 раённыя цэнтры: Чавусы (25 чэрвеня), Горкі (26), Шклоў (27), Быхаў (28), сотні вёсак і пасёлкаў [1, 4, 5, 7].

У Мінскай аперацыі 2-гі Беларускі фронт сваімі актыўнымі дзеяннямі пазбавіў немцаў магчымасці адарвацца і арганізавана адысці да Беразіны, скаваў сілы праціўніка і стварыў спрыяльныя ўмовы для наступлення непасрэдна на сталіцу БССР. Пры праследзе ворага, які адступаў, часці і злучэнні фронту 29 чэрвеня фарсіравалі Друць і 2 ліпеня Беразіну, вызвалілі райцэнтры

Бялынічы (29 чэрвеня), Чэрвень (2 ліпеня), Беразіно (3 ліпеня). Воіны 33-й арміі пры разгроме групіроўкі ворага ў раёне в. Жукавец ліквідавалі 2500 нямецкіх салдат і афіцэраў, з якіх 500 патанула ў Беразіне, захапілі 17 танкаў, 20 самаходных гармат, 52 мінамёты, 120 палявых гармат, 1500 аўтамашын [1, 4–6].

Нягледзячы на ўпартае супраціўленне 9-й і 4-й армій вермахта, у цэлым паспяхова разгортвалася распачатае 24 чэрвеня наступленне правага крыла 1-га Беларускага фронту. Тут былі нанесены ўдары з раёна Рагачова ў напрамку Бабруйск – Асіповічы і з раёна на поўдзень ад пасёлка Парычы (вызвалены 26 чэрвеня) у бок Бабруйска – Слуцка. За 6 дзён войскі правага крыла 1-га Беларускага фронту акружылі і разграмілі сіламі 48, 65, 16-й паветраных армій, авіяцыі дальняга дзеяння 40-тысячную бабруйскую групіроўку вермахта ў складзе 6 дывізій і 29 чэрвеня авалодалі Бабруйскам. У акружэнні і ліквідацыі бабруйскай групіроўкі ворага актыўна ўдзельнічала 1-я брыгада рачных караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі. У выніку былі разбіты галоўныя сілы 9-й нямецкай арміі, знішчана да 50 тыс. гітлераўскіх салдат і афіцэраў, узята ў палон больш за 23 тыс. акупантаў, падбіты і захоплены 366 танкаў, больш за 5 тыс. гармат і мінамётаў. Пры вызваленні горада вызначыліся часці і злучэнні корпусаў пад камандаваннем ураджэнцаў Беларусі генералаў В.К. Урбановіча і А.З. Каравацкага, 399-я стралковая дывізія генерала Д.В. Казакевіча, таксама беларуса [1, 4, 7, 8].

Галоўныя сілы 1-га Беларускага фронту яшчэ да завяршэння разгрому бабруйскай групіроўкі ворага развілі наступленне на Мінск і Слуцк. Часці і злучэнні 28-й арміі (камандуючы А.А. Лучынскі) і конна-механізаванай групы (камандзір І.А. Пліеў) пры прасоўванні на захад пасля доўна вызвалілі райцэнтры Глуск і Акцябрскі (27 чэрвеня), Старыя Дарогі (28 чэрвеня), Любань і Слуцк (30 чэрвеня), Капыль (1 ліпеня). У баях па вызваленні Слуцка адзначыліся воіны 3-га гвардзейскага стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Ф.І. Перхаровіча, беларуса. Частка сіл 3-й (камандуючы А.В. Гарбатаў) і 65-й (камандуючы П.І. Батаў) армій пры наступленні на мінскім напрамку 28 чэрвеня авалодалі райцэнтрам Клічаў, горадам і буйным чыгуначным цэнтрам Асіповічы [1, 4, 7].

Да канца чэрвеня 1944 г. у выніку моцных удараў чатырох франтоў Чырвонай Арміі група нямецкіх армій «Цэнтр» апынулася ў катастрафічным становішчы. Абодва флангі групіроўкі былі абыдзены войскамі 3-га і 1-га Беларускіх франтоў. Пасля авалодання 2 ліпеня часцямі 48-й арміі і конна-механізаванай групы станцыямі Стоўбцы і Гарадзея была перарэзана чыгуначная лінія Мінск – Баранавічы, што пазбавіла асноўныя сілы ворага магчымасці мець чыгуначную сувязь з Баранавічамі і Брэстам. Такім чынам, склаліся спрыяльныя ўмовы для вызвалення Мінска [4, 5, 7].

## Вызваленне сталіцы

Выгнанне акупантаў з Мінска мела выключнае значэнне для далейшага прасоўвання савецкіх войск. Гарнізон праціўніка ў горадзе складаўся з 3 пяхотных і 1 танкавай дывізій, 3 палкоў СС і розных спецпадраздзяленняў. Вызваленне Мінска пачалося раніцай 3 ліпеня, калі ў горад з паўночнага ўсходу ўварваўся перадавы атрад 2-й гвардыі Тацынскага танкавага корпуса. Затым з поўначы да Мінска падышлі перадавыя часці 5-й гвардзейскай танкавай арміі. Танкістаў падтрымлівалі 11-я гвардзейская і 31-я арміі 3-га Беларускага фронту, якія таксама ўвайшлі ў горад. У сярэдзіне дня 3 ліпеня з паўднёвага ўсходу ў Мінск увайшлі войскі правага крыла 1-га Беларускага фронта (1-ы гвардзейскі Данскі танкавы корпус і часці 3-й арміі), якія на сваім шляху разбілі групіроўку ворага ў раёне Пухавічаў. На ўсходзе ад Мінска гітлераўскія фарміраванні не мелі магчымасці адарвацца ад войск 2-га Беларускага фронту і вялі баі на Беразіне [4, 5–8].

Да зыходу дня 3 ліпеня войскі 3-га і 1-га Беларускіх франтоў ачысцілі сталіцу БССР ад нямецкіх войскаў. Злучэнне ў горадзе і на захад ад яго войск гэтых франтоў завяршыла акружэнне ўсёй мінскай групіроўкі ворага. У катле на ўсход ад Мінска апынуліся асноўныя сілы 4-й, часткі 3-й танкавай і 9-й армій вермахта, якія мелі ў сваім складзе звыш 105 тыс. салдат і афіцэраў [4–6].

Вынікам першага этапу аперацыі «Баграціён» стала нанясенне цяжкага паражэння нямецкай групе армій «Цэнтр». Абарона германскіх войскаў была перарвана ў паласе шырынёй 400 км. За гэты час войскі 1-га Прыбалтыйскага, 3, 2 і правага крыла 1-га Беларускага франтоў прайшлі з цяжкімі баямі ў заходнім напрамку на глыбіню 225–280 км і вызвалілі больш за палову тэрыторыі Беларусі.

Узятыя ў акружэнне на ўсход ад Мінска нямецкія войскі спрабавалі арганізаваць прарыў у абыход горада з поўначы і поўдня ў агульным напрамку на Баранавічы. Для прарыву акружэння ў заходнім кірунку з асабовага складу разбітых дывізій былі створаны

баявыя групы. Рашэннем Стаўкі ВГК задача па ліквідацыі праціўніка была ўскладзена на войскі 2-га Беларускага фронту. Выдзеленыя для гэтага 33-я армія, частка сіл 49-й і 50-й армій пры актыўным удзеле фарміраванняў беларускіх партызан ва ўпартых баях з 5 па 13 ліпеня разграмілі рэшткі 4-й і 9-й армій вермахта. 7 ліпеня вораг прадпрыняў адчайную спробу ўварвацца ў Мінск. Буйной групіроўцы гітлераўцаў удалося захапіць аэрадром, пранікнуць у горад у раёне Тэатра оперы і балета. У такой сітуацыі Беларускі штаб партызанскага руху 5 ліпеня загадаў часова прыпыніць расфарміраванне партызанскіх брыгад і атрадаў у вызваленных ад акупантаў раёнах і накіраваць іх у Мінск. На працягу 8 і 9 ліпеня ў ваколіцы сталіцы было сцягнута да 17 партызанскіх брыгад, многія з якіх адразу прыступілі да ліквідацыі варожых груп. Партызаны ўзялі пад ахову ўрадавыя будынкі, заводы, аэрадром і іншыя аб'екты. Больш за 15 баёў правялі партызаны з 8 да 13 ліпеня ў ваколіцах Мінска, разграмілі каля 10 батальёнаў і рот акупантаў, знішчылі, па розных звестках, ад некалькі сотняў да больш за тысячу гітлераўцаў і звыш 2 тысяч узялі ў палон [3, 4, 9].

Па звестках штабоў 2-га Беларускага фронту і яго армій, у баях з праціўнікам, узятым у «кацёл», было забіта 72 500 салдат і афіцэраў, разбіта 950 гармат і мінамёты, звыш 1,5 тыс. аўтамашын, узяты ў палон 35 743 нямецкія салдаты і афіцэры, з якіх 12 генералаў, у тым ліку 3 камандзіры корпуса і 6 камандзіраў дывізій. Савецкія войскі захапілі 550 гармат і мінамётаў, 900 аўтамашын, шмат складоў з ваенным рыштункам [2, 5, 6].

У гонар вызвалення Мінска 16 ліпеня на тэрыторыі былога іпадрома адбыўся мітынг працоўных і партызан з удзелам дэлегацый воінаў 3-га Беларускага фронту і працоўных г. Горкага. Пасля мітынгу адбыўся парад больш як 30 тыс. партызан [4, 9, 10].

## Этап другі: рух у заходнім напрамку

Пасля вызвалення Мінска і завяршэння першага этапу аперацыі «Баграціён», у адпаведнасці з указаннямі Стаўкі ВГК, савецкія войскі прыступілі да ажыццяўлення другога этапу і правялі 5 франтавых наступальных аперацый. Задача 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў палягала ў тым, каб разграміць войскі вермахта ў Літве і Латвіі і адсекчы групу армій «Поўнач» ад астатніх групіровак праціўніка. Для зрыву наступлення 1-га Прыбалтыйскага і трох Беларускіх франтоў германскае камандаванне перакінула ў паласу іх дзеянняў дадатковыя сілы з групы армій «Поўнач», «Паўночная Украіна», «Паўднёвая Украіна», з Нарвегіі, Германіі, Венгрыі, Польшчы. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту падчас наступлення ў агульным напрамку на Шаўляй паслядоўна вызвалілі беларускія райцэнтры: Паставы (5 ліпеня), Браслаў (6), Відзы (8) [4–7].

У наступальных дзеяннях 3-га Беларускага фронту на Вільнюс і Ліду савецкія войскі вызвалілі ад акупантаў 5 ліпеня Маладзечна, Свір, Смаргонь, райцэнтры Валожын, Івянец і перамясціліся за дзень на 14–20 км. У далейшых баях на тэрыторыі Беларусі ў межах Вільнюскай аперацыі часці і злучэнні 3-га Беларускага фронту авалодалі Ашмянамі і Іўем (8 ліпеня), Лідай (9), Радунню (11) [4, 6, 7].

Адразу пасля завяршэння Мінскай аперацыі асноўныя сілы 2-га Беларускага фронту без аператыўнай паўзы сталі рухацца ў заходнім напрамку. Часці і злучэнні 49-й арміі 7 ліпеня вызвалілі Дзяржынск, а 8 ліпеня войскі 3-й арміі і армейскі рухомы атрад 50-й арміі авалодалі Карэлічамі і Навагрудкам. Захоўваючы высокія тэмпы наступлення, войскі фронту за наступныя 5 дзён, нягледзячы на ўпартае супраціўленне немцаў, фарсіравалі тры водныя рубяжы і прасунуліся на захад на 120–125 км. За гэты перыяд былі адбіты ў ворага райцэнтры Зэльва, Скідаль (12 ліпеня), Масты, Шчучын (13), Ваўкавыск (14). Часці і злучэнні 50-й арміі, уведзеныя ў аперацыю 10 ліпеня, за 6 дзён баёў выйшлі на мяжу рэк Свіслач і сярэдняга цячэння Нёмана, фарсіравалі водныя перашкоды і 16 ліпеня сумесна з 31-й арміяй 3-га Беларускага фронту вызвалілі асноўную частку Гродна [4, 6, 7].

Найбольш жорсткія баі адбываліся ў раёне Гродна і райцэнтра Свіслач, куды гітлераўскае камандаванне здолела падцягнуць да 10 дывізій. Тут супраціўленне праціўніка было зламана 23–24 ліпеня, што дало магчымасць сілам 2-га і 3-га Беларускіх франтоў 24 ліпеня поўнасцю вызваліць Гродна, а часцям і злучэнням 3-й арміі 27 ліпеня авалодаць буйным прамысловым цэнтрам і важным траспартным вузлом – г. Беластокам. У выніку Беластоцкай аперацыі войскі 2-га Беларускага фронту з 5 па 27 ліпеня прайшлі з баямі больш за 300 км і выйшлі на подступы да граніцы Усходняй Прусіі. Савецкія воіны вызвалілі каля 30 тыс. км$^2$ тэрыторыі і сотні населеных пунктаў, разграмілі 3 пяхотныя і 1 танкавую дывізіі. Акрамя таго, 4 пяхотным і 2 танкавым дывізіям, 2 брыгадам, паліцэйскай групе «Готберг» са складу 4-й нямецкай арміі былі нанесены вялікія страты ў баявой тэхніцы, розных

матэрыяльных сродках і людзях – з 1 па 31 ліпеня 1944 г. забіта 9812 нямецкіх салдат і афіцэраў [2, 4–7].

Яшчэ да завяршэння першага этапу аперацыі «Баграціён» арміі правага крыла 1-га Беларускага фронту выйшлі да важнага транспартнага вузла – г. Баранавічы. У сувязі з тым, што ў першых эшалонах стралковых карпусоў меліся абмежаваныя сілы і сродкі, з ходу горад узяць не ўдалося. Падчас наступлення на баранавіцка-брэсцкім напрамку часці 28-й арміі і конна-механізаванай групы І.А. Пліева 5 ліпеня вызвалілі Ляхавічы – населены пункт, які немцы ператварылі ў моцны пункт абароны. Баранавічы былі раптоўна атакаваны ноччу 8 ліпеня злучэннямі 65-й і 28-й армій з розных напрамкаў, і нямецкія часці былі вымушаны пакінуць горад. Пры праследзе праціўніка савецкія войскі захапілі плацдармы каля Слоніма і 10 ліпеня цалкам ачысцілі горад, авалодалі райцэнтрам Быцень, а 12 ліпеня вызвалілі Ружаны [4–8].

Адначасова з рухам галоўных сіл правага крыла 1-га Беларускага фронту на Баранавічы, Слонім, Ружаны войскі 61-й арміі ва ўзаемадзеянні з Дняпроўскай ваеннай флатыліяй, партызанскімі злучэннямі Палескай і Пінскай абласцей, аператыўнай групай умацаваных раёнаў і 55-й стралковай дывізіяй 28-й арміі развівалі наступ па паўночным беразе рэк Прыпяць, Гарынь і Стыр. Пераадольваючы ўпартую абарону праціўніка і шматлікія водныя перашкоды, савецкія воіны за кароткі час вызвалілі райцэнтры Тураў (5 ліпеня), Жыткавічы (6), Ганцавічы і Столін (7), Лунінец (10). Разгром праціўніка ў раёне Баранавіч, дзе паспяхова дзейнічаў 3-ці гвардзейскі стралковы корпус пад камандаваннем генерала Ф.І. Перхаровіча, і на рубяжы р. Шчара



Савецкія танкісты на вуліцах вызваленага Магілёва. 28 чэрвеня 1944 г

стварыў пагрозу для Пінскай групіроўкі, якая была вымушана пачаць адыход. Гэта паскорыла рух 61-й арміі ўздоўж паўночнага берага Прыпяці, у выніку чаго яе часці і злучэнні ва ўзаемадзеянні з караблямі Дняпроўскай рачной ваеннай флатыліі да раніцы 14 ліпеня 1944 г. зламалі супраціўленне гарнізона ў Пінску. Такім чынам, германскае камандаванне страціла добра ўмацаваны пункт на кобрынска-брэсцкім напрамку і важнейшы транспартны вузел [4–6, 8].

Войскі правага флангу 1-га Беларускага фронту за 12 дзён другога этапу аперацыі «Баграціён» прасунуліся на 150–170 км і значна палепшылі свае аператыўнае становішча – працягласць яго лініі скарацілася практычна ўдвая. 17 ліпеня лінія размежавання праходзіла на захад ад райцэнтра Свіслач (вызвалены 17 ліпеня) і Відамлі, на ўсход ад Кобрына і на захад ад Драгічына (вызвалены 17 ліпеня) і да Ковеля [4–6, 8].

Частка акупіраванай тэрыторыі на поўначы Беларусі была вызвалена войскамі 2-га Прыбалтыйскага фронту (камандуючы А.І. Яроменка). Падчас Рэжыцка-Дзвінскай наступальнай аперацыі (10–27 ліпеня) войскі 4-й ударнай арміі (камандуючы П.Ф. Малышаў) 12 ліпеня авалодалі райцэнтрамі Дрыса (Верхнядзвінск) і Расоны, 17 ліпеня – Асвеяй [4, 6, 7].

## Вызваленне усёй тэрыторыі Беларусі

Завяршальны этап вызвалення Беларусі адбываўся ў Люблін-Брэсцкай аперацыі (18 ліпеня – 2 жніўня 1944 г.). З першых дзён яе разгортвання, нягледзячы на моцнае супраціўленне гітлераўцаў, савецкія войскі паслядоўна вызвалялі населеныя пункты і сціскалі акружэнне вакол Брэста. Ужо да зыходу 18 ліпеня злучэнні 48-й і 65-й армій вызвалілі г.п. Антопаль і кантралявалі транспартныя вузлы – Свіслач і Гайнаўку. Пасля заняцця 18 ліпеня райцэнтра Жабінка часцям і злучэнням 28-й арміі на наступны дзень давялося адбіць 12 контратак гітлераўцаў. Пры наступленні ў напрамку Брэста 61-я армія, прарваўшы абарону праціўніка па р. Мухавец, раніцай 20 ліпеня авалодала буйным транспартным вузлом – г. Кобрынам, а 23 ліпеня заняла Дамачава за 45 км на поўдзень ад Брэста [3, 4].

Акружэнне брэсцкай групіроўкі акупантаў пачалі і злучэнні 65-й арміі, якія выйшлі 21 ліпеня да р. Заходні Буг і пасля яе фарсіравання захапілі плацдарм. Войскам арміі ў раёне населеных пунктаў Высокае і Кляшчэлі давялося дзейнічаць ва ўмовах моцнага супрацьдзеяння нямецкіх пяхотных часцей, якія 22 ліпеня пры падтрымцы да 85 танкаў і штурмавых гармат перайшлі ў наступленне. 23–26 ліпеня ў гэтым раёне адбываліся напружаныя баі. У контрудары супраць групіроўкі праціўніка ў складзе 5 дывізій (2 з якіх танкавыя) разам з войскамі 65-й арміі ўдзельнічалі злучэнні 48-й арміі і стралковы корпус 28-й арміі. За дзень баёў 25 ліпеня толькі войскі 65-й арміі падбілі 38 танкаў, знішчылі звыш 1300 салдат і афіцэраў [3, 4].

Пры прасоўванні на іншых напрамках войскі 28-й і 70-й армій 27 ліпеня выйшлі да рэк Лясная і Заходні Буг і тым самым завяршылі акружэнне варожых сіл у раёне Брэста. Нямецкія і венгерскія фарміраванні, якія імкнуліся любой цаной вырвацца з акружэння, на працягу 28 ліпеня зрабілі больш за 50 атак сіламі пяхоты з танкамі і штурмавымі гарматамі. Адбіўшы ўсе контрудары праціўніка, войскі 28-й і 70-й армій сумесна з 9 гвардзейскім стралковым корпусам 61-й арміі спачатку рассеклі брэсцкую групіроўку ворага, а затым штурмам авалодалі горадам і ўмацаваным раёнам. У гэты ж дзень часці 34-й гвардзейскай і 152-й стралковых дывізій 28-й арміі авалодалі г. Высокае. Такім чынам, 28 ліпеня 1944 г. у выніку Люблін-Брэсцкай аперацыі было завершана вызваленне Чырвонай Арміяй усёй цяперашняй тэрыторыі Беларусі [3, 4, 6, 7].

Аперацыя «Баграціён» паводле замыслу, маштабаў, эфектыўнасці і значнасці займае асаблівае месца ў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнах. Была павержана адна з наймацнейшых групіровак вермахта – група войск «Цэнтр». Разгром гітлераўскіх захопнікаў меў вялікае значэнне для вызвалення Прыбалтыкі, Заходняй Украіны, Польшчы і стварыў спрыяльныя ўмовы для далейшага наступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Германіі [3, 4, 10].

Падчас гэтай аперацыі вялізную дапамогу савецкім войскам аказалі партызаны, падпольшчыкі і насельніцтва Беларусі. У першыя дні наступленння франтоў дыверсійныя групы партызанскіх фарміраванняў падарвалі 20 тыс. рэек, а толькі з 26 па 29 чэрвеня – 147 воінскіх эшалонаў. На рахунку народных мсціўцаў – 8 разбураных чыгуначных мастоў. Пасля першых удараў партызан поўнасцю спыніўся рух на многіх чыгуначных лініях, з-за чаго пры адступленні нямецкае камандаванне не мела магчымасці ў дастатковай меры выкарыстоўваць транспарт для перакідвання рэзерваў і эвакуацыі сваіх часцей і тылоў. Партызаны таксама захоплівалі чыгуначныя станцыі (Будслаў, Гудагай, Княгінін, Парахонск і інш.) і ўтрымлівалі іх да прыходу Чырвонай Арміі [3, 4, 10].

Партызанскія фарміраванні ў месцах сваёй дыслакацыі бралі пад кантроль участкі шашэйных і грунтовых дарог, знішчалі жывую сілу і тэхніку падраздзяленняў, якія адступалі, разбівалі штабы, гарнізоны. Партызаны захапілі і пабудавалі новыя масты і пераправы праз рэкі Друць, Пціч, Случ, Бярэзіну, Нёман, указвалі часцям Чырвонай Арміі найбольш бяспечныя і зручныя шляхі руху, рамантавалі дарогі, забяспечвалі часці і падраздзяленні Чырвонай Арміі праваднікамі і разведвальнымі дадзенымі аб групіроўках і рубяжах абароны нямецкіх войск. Брыгады і атрады ратавалі насельніцтва ад знішчэння, а гарады і вёскі ад разбурэння і спалення, стойка ўтрымлівалі буйныя партызанскія зоны, праз якія спрабавалі прабівацца нямецкія войскі. Усяго ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў час іх адступлення партызаны знішчылі больш за 15 тыс. і ўзялі у палон больш за 17 тыс. акупантаў [3, 4, 10].

Партызанскія фарміраванні сумесна з савецкімі часцямі вызвалялі Мінск, абласныя цэнтры Вілейку і Пінск, 35 райцэнтраў. Астравец, Відзы, Івянец, Ілля, Капыль, Куранец, Карэлічы, Любча, Рудзенск, Свір, Старобін, Узда былі вызвалены брыгадамі і атрадамі самастойна і ўтрымліваліся да прыходу Чырвонай Арміі [3, 4, 10].

Па меры вызвалення тэрыторыі Беларусі каля 600 тыс. жыхароў рэспублікі, з якіх больш за 180 тыс. партызан – байцоў і камандзіраў прызыўнога ўзросту, уліліся ў шэрагі Чырвонай Арміі [3].

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Великая Отечественная война – день за днем (по материалам рассекреченных оперативных сводок Генерального штаба Красной Армии). Т. 7. – М., 2010.
2. История Второй мировой войны 1939–1945. В 12 т. Т. 9. – М., 1978.
3. Ваенная энцыклапедыя Беларусі. – Мінск, 2010.
4. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя. – Мінск, 1990.
5. Великая Отечественная война 1941–1945 годов. В 12 т. Т. 4. Освобождение территории СССР. 1944 год . – М., 2012.
6. Великая Отечественная война – день за днем (по материалам рассекреченных сводок Генерального штаба Красной Армии). Т. 8. – М., 2010.
7. Освобождение городов: справочник по освобождению городов в период Великой Отечественной войны. – М., 1985.
8. Рокоссовский К.К. Солдатский долг // К.К. Рокоссовский. – Минск, 1984.
9. Калинин П.З. Партизанская республика / П.З. Калинин. 3-е изд. – Минск, 1968.
10. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. – Минск, 1983–1985. Т. 3. – 1985.